**Рада па медыяэтыцы: Еўрарадыё не парушыла Кодэкс прафесійнай этыкі беларускіх журналістаў**

**ЗАЯВА**
**Рады па медыяэтыцы**
**16 кастрычніка 2025 года**

Рада па медыяэтыцы ў складзе **Надзеі Белахвосцік, Валера Карбалевіча, Ганны Соўсь, Зміцера Гурневіча, Зоі Хруцкай, Ірыны Новік, Лолы Бурыевай** разгледзела зварот **Галіны Жарко** адносна артыкула "Андрей Стрижак и непрошенные дикпики", апублікаванага на Еўрарадыё 21 ліпеня 2025 года на адпаведнасць журналісцкім стандартам.

Спадарыня Жарко сцвярджае, што рэдакцыя Еўрарадыё дапусціла шэраг парушэнняў журналісцкіх стандартаў і этыкі:

1. Недастатковасць кантэксту першакрыніцы. Матэрыял абапіраецца толькі на скрыншоты інтымных фота без дакладнага адлюстравання поўнага кантэксту перапіскі (напрыклад, ці прысутнічалі элементы флірту). Поўны кантэкст важны для аб'ектыўнай ацэнкі этычнага вымярэння сітуацыі.
2. Недастатковасць балансу меркаванняў. Акрамя пазіцый бакоў канфлікту (абвінаваўцы і фігуранта), у матэрыяле адсутнічае меркаванне незацікаўленых экспертаў (юрыстаў, псіхолагаў, сацыёлагаў), неабходнае для шматбаковага разгляду сітуацыі.
3. Адсутнасць кантэкстуальнага аналізу з'явы. Артыкул канцэнтруецца толькі на прыватным выпадку і не пераходзіць да аналізу з'явы ў шырокім сацыяльным і прававым кантэксце (распаўсюджанасць, юрыдычная ацэнка паводзін дарослых).

Рада палічыла неабходным запрасіць на сваё пасяджэнне галоўнага рэдактара Еўрарадыё, каб высветліць абставіны падрыхтоўкі публікацыі.

У выніку разгляду і абмеркаванняў Рада

**УСТАНАВІЛА:**

1. Рэдакцыя бачыла перапіску і пацвердзіла, што элементаў флірту, якія маглі б істотна змяніць кантэкст, не было. Пры гэтым Рада лічыць, што наяўнасць флірту абсалютна не азначае дазволу на дасыланне фотаздымкаў такога кшталту.
2. Баланс у публікацыі быў захаваны. Рэдакцыя Еўрарадыё звярнулася да Андрэя Стрыжака і прадставіла яму магчымасць выказацца, пра што ёсць згадка ў тэксце. Звярнулася рэдакцыя і да эксперткі. Яе каментар быў

апублікаваны ў выглядзе асобнага артыкула. Журналісцкія стандарты не патрабуюць уключэння ўсёй інфармацыі ў адну публікацыю, бо для эфектыўнага ўтрымання ўвагі чытача тэкст не можа быць празмерна доўгім..

3. Медыя не абавязана ўсе аспекты тэмы змяшчаць у адзін артыкул. Аналіз з'явы ў шырокім кантэксце можа быць прадметам наступных публікацый і не з'яўляецца парушэннем журналісцкай этыкі ў кантэксце дадзенага матэрыялу.

З улікам выкладзенага, Рада па медыяэтыцы

**ВЫРАШЫЛА:**

1. У артыкуле "Андрей Стрижак и непрошенные дикпики", апублікаваным на Еўрарадыё 21 ліпеня 2025 года, АДСУТНІЧАЮЦЬ парушэнні Кодэкса прафесійнай этыкі беларускіх журналістаў.
2. Адпаведна п. 18.3 Пагаднення аб самарэгуляванні незалежнага беларускага медыясектара рашэнні Рады па медыяэтыцы, прынятыя па выніках разгляду індывідуальных зваротаў, абскарджанню не падлягаюць.

Старшыня Рады па медыяэтыцы Надзея Белахвосцік